# Касалапы стаў на лапы

**СМАРГОНЬ. У святочны масленічны дзень у райцэнтры на галоўнай алеі парку ўрачыста адкрывалі новую скульптурную кампазіцыю "Мядзведжая акадэмія".**

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі выказаў пачуццё гонару за сваіх землякоў. У смаргонскага краю, нагадаў ён, багатая гісторыя, тут нямала творчых людзей, і вельмі добра, што ўдаецца падтрымаць іх добрыя задумкі.

Калі ганаровыя госці, сярод якіх і аўтар кампазіцыі скульптар Уладзімір Церабун, знялі покрыў са скульптур, усіх уразілі вялізны, ростам два метры і сорак сантыметраў, танцор-мядзведзь і два павадыры-скамарохі.

– *Унутры яны пустацелыя, але з месца не зрушыш – у падмурках ёсць закладныя пласціны, якія трывала трымаюць усе фігуры на месцы,* – запэўніў скульптар.

Карэспандэнту "ГП" Уладзімір Васільевіч прызнаўся, што распрацаваў эскіз помніка "Мядзведжай акадэміі" больш дзесяці гадоў таму, да 500-годдзя Смаргоні:

– *І нядзіўна – гэта ж брэнд горада, яго гісторыя, яго памяць. Ні ў адным з гарадоў Еўропы не было такой школы дрэсіроўкі мядзведзяў – толькі ў Смаргоні.*

*Мы пайшлі на эксперымент – адлілі фігуры з чугуна. Раней такой тэхналогіі ў Беларусі не было. Затое ўдвая танней, чым з бронзы, з якой планавалася. Канешне, я рызыкаваў, бо вопыту ў "чугуннай" справе ў мяне не было ніякага. Заняла ўся праца тры месяцы – ад адліўкі да ўстаноўкі. Работа выконвалася ў скульптурным камбінаце, потым фігуры адлівалі на радыятарным заводзе ў Мінску. Заказчык работ – УКБ райвыканкама, генеральны падрадчык – будаўнічы трэст №41.*

*У маі плануем побач з кампазіцыяй паставіць камень, на якім напішам, што яна азначае, якому перыяду гісторыі прысвечана. Побач паставім лаўкі і ліхтары. Якое цудоўнае месца для прагулак атрымаецца!*

**– На вашу думку, помнікаў якім падзеям не хапае гораду?**

– *Сёлета патрэбна ўсталяваць мемарыял, прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны. Гэта самае важнае. Зараз абмяркоўваецца ідэя ўстаноўкі ў Крэве памятнага знака, прысвечанага Крэўскай уніі. Ёсць задумка зрабіць яго ў выглядзе шахматнай фігуры – каралеўскай ладдзі. Былі планы ўсталяваць помнік яшчэ адной гістарычнай падзеі – менавіта ў Смаргоні Напалеон склаў з сябе камандаванне арміяй і кінуўся ў бегства. Абгаворваліся планы ўстаноўкі "Лаўкі Напалеона". Багатую гістарычную спадчыну трэба выкарыстоўваць.*

Мядзведзь і скамарохі цэлы дзень да змяркання знаходзіліся ў шчыльным людскім коле. Хтосьці хацеў тут сфатаграфавацца, хтосьці датыкнуцца да фігуры – на ўдачу.



Фота аўтара

**Наталія ВАЛЫНЕЦ**